# ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

Весці БДПУ. Серыя 1. 2020. № 2. С. 87–90

*УДК 821.161.3 М. Гарэцкі*

*UDC 821.161.3 М. Гарэцкі*

## МАСТАЦКІ І НАВУКОВЫ ЗАПАВЕТ МАКСІМА ГАРЭЦКАГА

## ARTISTIC AND SCIENTIFIC HERITAGE OF MAXIM HARETSKI

**Т. М. Тарасава,**
*доктар філалагічных навук, дацэнт; прафесар кафедры беларускай і замежнай літаратуры Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*

**T. Tarasava,**
*Doctor of Philology, Associate Professor, Professor of the Department of Belarusian and Foreign Literature, Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*

Паступіў у рэдакцыю 05.02.20.

Received on 05.02.20.

У артыкуле раскрываецца сутнасць мастацкіх і навуковых адкрыццяў беларускага пісьменніка Максіма Гарэцкага, якія істотна паўплывалі на шляхі развіцця нацыянальнай прозы ХХ ст. Звяртаецца ўвага на адкрыццё пісьменнікам новых пластоў рэчаіснасці: жорсткая праўда пра вайну і чалавека на вайне, глыбіня ўнутранага свету чалавека, пакутлівыя пошукі нацыянальнай інтэлігенцыі, роздум над праблемамі развіцця нацыі і яе месцы ў еўрапейскай супольнасці. Аналіз навукова-даследчай дзейнасці М. Гарэцкага (кніга «Гісторыя беларускае літаратуры») дае магчымасць гаварыць пра выдатныя здольнасці М. Гарэцкага-тэарэтыка, які заклаў падмурак беларускага тэарэтычнага літаратуразнаўства, глыбока выявіў гуманістычны аспект мастацкай літаратуры.

*Ключавыя словы*: беларуская літаратура, экзістэнцыяльнае мысленне, паэтыка экзістэнцыяльнага тыпу, экзістэнцыяльны псіхалагізм, дзённікавая проза, тэхніка снабачання, культурна-гістарычная школа, літаратурная кампаратывістыка.

The article reveals the essence of artistic discoveries of the Belarusian writer Maxim Garetski which influenced the ways of development of national prose of the XX century. Attention is paid to discovery by the writer of new layers of reality: cruel truth about war and person on war, depth of human inner world, poignant search of national intelligence, thinking over the problems of development of the nation and its place in the European community. The analysis of scientific-research activity of M. Garetski (the book “History of the Belarusian literature”) allows to tell about his excellent abilities as a theoretician who made fundament for Belarusian theoretical literature studies, deeply revealed the humanistic aspect of fiction literature.

*Keywords:* Belarusian literature, existential thinking, poetics of existential type, existential psychologism, diary prose, technique of daydreaming, cultural-historical school, comparative studies of literature.

Максім Гарэцкі – пісьменнік надзвычай глыбокі ў пошуках сэнсу алагічна-загадкавага, таямніча-няўлоўнага быцця, у спасціжэнні экзістэнцыяльнай сутнасці чалавека. Мастак надаў беларускай прозе еўрапейскае аблічча. У яго творах знайшла ўвасабленне арыгінальная мадэль тыпалагічнага спалучэння адметнасцей еўрапейскага экзістэнцыялізму і рускага псіхалагізму. М. Гарэцкі адзін з першых у беларускай прозе фарміруе экзістэнцыяльны погляд на чалавека і свет, выпрацоўвае арыгінальныя прынцыпы паэтыкі экзістэнцыяльнага тыпу (экстрэмальная сітуацыя, мяжа жыццё – смерць, плынь свядомасці, снабачанні), здольныя найбольш адэкватна адлюстраваць алагічны свет і знявечаную свядомасць чалавека ХХ ст.

Максім Гарэцкі паспяхова працаваў у самых розных галінах: у мастацкай прозе і літаратурнай крытыцы, у літаратуразнаўстве і мастацкай публіцыстыцы. У мастацтве слова пісьменнік адкрывае новыя пласты рэчаіснасці: жорсткую праўду пра вайну і чалавека на вайне, таямнічыя глыбіні ўнутранага свету чалавека, пакутлівыя пошукі нацыянальнай інтэлігенцыі, роздум над праблемамі развіцця нацыі і яе месцы ў еўрапейскай супольнасці.

Не менш істотным з’яўляецца ўнутраная цэласнасць М. Гарэцкага-мастака. А выявілася яна ва ўсім: у паслядоўнасці, у глыбокім пачуцці абавязку перад жыццём, народам, перад літаратурай, бацькамі, сям’ёй, у далучанасці да ўсяго жывога, у трывозе за заўтрашні дзень сваёй зямлі, нацыі, чалавецтва. Аўтар манаграфіі «Браму скарбаў сваіх адчыняю...» А. Адамовіч справядліва канстатуе: «Незвычайная вернасць сабе, таленту свайму, адданасць вялікай літаратуры – вось што робіць такім цэласным абарваны лёс і шлях Максіма Гарэцкага» [1, с. 87]. Пісьменнік, глабальна асэнсоўваючы сітуацыю чалавека ў пачатку ХХ ст., выяўляючы найскладанейшую дыялектыку ўзаемаадносін людзей у свеце, эвалюцыю іх свядомасці, у рэчышчы еўрапейскага літаратурнага працэсу ўздымае праблему маральных межаў. Мастацкія адкрыцці, зробленыя М. Гарэцкім, раўназначны адкрыццям у заходнееўрапейскай і рускай літаратурах М. Пруста, Ф. Кафкі, Р. Музіля, А. Белага, І. Буніна, У. Набокава і інш.

Арыгінальным творам дзённікавай прозы, які мае свае спецыфічныя структурныя элементы і літаратурна-эстэтычныя вартасці, выступаюць дакументальна-мастацкія запіскі «На імперыялістычнай вайне». Іх стылёвы лад неаднародны: у творы спалучаны ўласна штодзённыя запісы і мастацкія накіды. У кароткіх штодзённых занатоўках пераважаюць стыль прадметнай дакладнасці, эстэтыка голага факта, які перадае напружаны, неспакойны рытм духоўнага жыцця героя. Аб’яднанне дзённіка і запісак у адным творы абумоўлена, па-першае, аўтарскай ідэйна-тэматычнай дамінантай, якой з’яўляецца антываенная праблематыка. Па-другое, М. Гарэцкі не мог у ваенных умовах вытрымліваць строгую метадалагічную паслядоўнасць, душа мастака патрабавала творчага самавыяўлення, а франтавыя ўмовы гэтаму не спрыялі: «Я са страхам думаў, што мушу так жыць цэлых два гады. (Звычайныя салдаты служылі на цэлы год болей, і я пайшоў вальнапісаным, каб скараціць гэты тэрмін.) Мне шкода было загубленага часу, загубленых маладых сіл» [2, с. 12].

У такіх умовах дзённік быў і своеасаблівым тэрапеўтычным сродкам пераадолення духоўнай адзіноты.

Аналітычны розум М. Гарэцкага не замкнёны на чыста экзістэнцыяльнай рэфлексіі, пісьменніка закружыў віхор ваенных падзей. Плынь уражанняў патрабавала дакладна фіксаваць тагачасны стан свету, пазбаўлены логікі і сэнсу. Вядома, М. Гарэцкі не стаяў перад дылемай: дзённік ці запіскі. Безумоўна адно – «унутраны» чалавек больш прывабны для М. Гарэцкага. «Нет ничего интереснее второй жизни человека; внешняя жизнь выставлена напоказ всем. Внутренняя же, вторая жизнь есть скрытая основа, которая управляет всем существованием человека», – пісаў У. Адоеўскі ў «Дзённіках» [3, с. 146]. Удалае спалучэнне дзённіка з запіскамі глыбей выявіла маштабнасць філасофскай думкі пісьменніка, антываенную светапоглядную пазіцыю мастака, глыбінныя асновы характару чалавека, што дае падставы гаварыць пра М. Гарэцкага як прадаўжальніка лепшых экзістэнцыяльных традыцый рускай і замежнай літаратур.

Дакументальна-мастацкія запіскі, у якіх сышліся разам дакументалізм і мастацкасць, спрыялі арганічнаму адлюстраванню дакументальных фактаў і духоўнага жыцця асобы ў экстрэмальных умовах вайны, фіксацыі найтанчэйшых пераходаў ад знешняга да ўнутранага. Напружанасць уласнага ўнутранага жыцця, перададзеная праз яго знешнія праявы, адлюстроўвае дынаміку мастацкага мыслення М. Гарэцкага: ад прозы жыцця – да паэзіі экзістэнцыяльнай душы ў навакольным свеце.

Знакавым творам у творчай біяграфіі М. Гарэцкага стала аповесць «Дзве душы». У творы пісьменнік спрабуе разгадаць таямніцу чалавека ў новых сацыяльных умовах, народжаных ломкай старога свету, у надзвычай складаным гістарычным часе. Мастацкі прыём раздваення душы быў уласцівы і ранняму псіхалагізму пісьменніка, толькі факт сутыкнення дзвюх іпастасей становіцца ў творы канцэптаўтваральным. Герой аповесці Ігнат Абдзіраловіч не належыць да тыпу людзей, нованароджаных рэвалюцыяй, ён мае пад сабой пэўную асветную і культурную глебу, сфарміраваную папярэдняй эпохай, таму не можа быць механічна запраграмаваны толькі на дзеянне. У асобе Ігната не назіраецца вонкавага сутыкнення чалавека экзістэнцыяльнага і сацыяльнага, герой М. Гарэцкага непасрэдна не далучаны да паслярэвалюцыйных перабудовачных працэсаў, таму раздваенне асобы ідзе па лініі толькі экзістэнцыяльных параметраў. Канфлікт уласных пачуццяў, унутраных перажыванняў выклікае незадаволенасць сабой, дваістасць душы, адзіноту і непрыкаянасць. Абдзіраловіч умее прыслухоўвацца да тонкіх зрухаў уласнай душы, то «цярпліва-спакойнай», то «шчымліва-трывожнай»: «Душа двайлася. Адна палова несказанна плакала і жалілася на другую, нашто яна мучыць яе падманкамі. І … казала: “Уцячы, уцячы...”» [4, с. 24]; «Дзве душы. Тая, што плакала і жалілася на другую, нашто яна мучыць яе падманкамі, цяпер цвярдзее, але робіцца нядобраю, набірае ўсё болей нейкай калянасці і нават жорсткасці» [4, с. 26]; «Адна душа казала: “Мне ўсё роўна... Мне ўсё роўна...”. А другая прыкра балела і маўчала» [4, с. 29].

Абдзіраловічу ўласціва жаданне не столькі перабудаваць свет, колькі яго «перадумаць» (А. Камю). Інтэлігенту даспадобы быў сам працэс думання, яго паслярэвалюцыйная адзінота, вольнасць і незалежнасць, і герой не спяшаецца з самавызначэннем. Працэс мыслення ў Абдзіраловіча не абстрактны, не асацыяльны, ён ідзе ў напрамку пошукаў лёсавызначальных сэнсаў для свайго народа. Двайлася душа з прычыны пакутлівага роздуму над вытокамі сацыяльнай няроўнасці, ступенню адказнасці паноў за здзекі з паднявольнага люду. Герой аповесці разважае: «Але якая яснасць? Няма яснасці... Ёсць тое, што ён не ведаў, як назваць, але прадставіў: вялікая мутная лужына, ці нейкія паводкі, ці поўная дажджавой вады канава, а ў ёй паволі плыве шчэпінка, то плыве, то прыстоіць, то паціху пераракруціцца там, дзе была... Няма яснасці, бо няма галўнага. <…> Дык што ж галўнае?» [4, с. 35–36];

Экзістэнцыяльная свабода Ігната ўзвышае героя над іншымі персанажамі, пашырае абсягі яго бачання і магчымыя формы самавыяўлення; у паводзінах героя не назіраецца анархічнай уседазволенасці, перашкаджае гэтаму сумленне, сфарміраванае папярэдняй культурнай эпохай. Так, Ігнат Абдзіраловіч не чалавек дзеяння; у творы няма акрэсленага сацыяльнага канфлікту, але мы бачым напружаны ўнутраны канфлікт персанажа, які становіцца пастаянным фонам яго жыцця, атакуе яго псіхіку, толькі не вядзе да самаразбурэння асобы. М. Гарэцкі ў адпаведнасці з класічнай традыцыяй захаваў зносіны героя са знешнім светам, часта незразумелым, варожым, але прывабным сваёй непрадказальнасцю. Цікавасць да перамен у знешнім свеце ўтрымлівае Абдзіраловіча ад татальнай засяроджанасці на сабе, ад дэматэрыялізацыі свядомасці і звядзення чалавека да статусу біялагічнай істоты. Раздваенне душы героя не правакуе працэс самаразбурэння. Арыгінальны мастацкі прыём адкрыў перад М. Гарэцкім магчымасць падаць вобраз персанажа ў незафіксаваным стане паміж зямным жыццём і экзістэнцыяльным існаваннем, паміж сацыяльнымі структурамі, здольнымі падавіць індывідуальнае «я», і ўтапічнай марай падняць канкрэтна-гістарычнае жыццё да філасофскага. Вобраз інтэлігента Абдзіраловіча ёсць спалучэнне ў адной асобе і чалавека сацыяльнага, гістарычна матываванага, і чалавека экзістэнцыяльнага, па-філасофску ўніверсальнага.

Досыць плённымі аказаліся здабыткі М. Гарэцкага і ў паэтыцы: найперш маецца на ўвазе выкарыстанне тэхнікі снабачання. Дзякуючы М. Гарэцкаму матыў сну трывала замацаваўся ў беларускай мастацкай прозе XX ст., даючы пісьменнікам магчымасць філасофстваваць, не прытрымліваючыся законаў логікі і рацыянальнага мыслення. Сон прасторава пашырае рамкі мастацкага твора. Праз снабачанні беларускі пісьменнік зазірае ў падсвядомыя глыбіні чалавека, выяўляе цьмяныя памкненні героя, парог яго разумовых магчымасцей. М. Гарэцкі быў схільны эксперыментаваць, і сёння трэба прызнаць яго эксперыменты плённымі.

Відавочна, што М. Гарэцкі шырока выкарыстоўвае ў творах выяўленчыя магчымасці як класічнага псіхалагізму, так і яго новыя формы: «плынь свядомасці», асацыятыўнае мысленне, адсутнасць матывацыі, паэтыку кінематаграфічнага кадра – прыёмы цалкам новыя для тагачаснай беларускай літаратуры. Пісьменнік тым самым узбагачаў паэталагічныя здабыткі нацыянальнай прозы, удасканальваў жанрава-стылёвыя формы прыгожага пісьменства. У гэтым сэнсе М. Гарэцкі надзвычай сугучны Ф. Кафку, М. Метэрлінку, Л. Андрэеву, А. Беламу.

Для беларускай літаратуры першай трэці XX ст. характэрна розная ступень увасаблення экзістэнцыяльнай свядомасці. У творах М. Гарэцкага экзістэнцыяльнае светаадчуванне набывала абрысы новай канцэпцыі чалавека і свету і афармлялася ў выразную эстэтычную сістэму. Безумоўна, знаёмства з еўрапейскім мастацкім вопытам, пільная засяроджанасць на такіх катэгорыях чалавечага быцця, як жыццё, смерць, вайна, мір, інтуітыўнае адчуванне адзінства чалавека і прыроды, суаднесенасць такіх паняццяў, як Бог і чалавек, давалі багаты матэрыял для роздуму. Катэгорыі сну, прадбачання, інтуітыўнага, падсвядомага, якія атрымалі шырокае распаўсюджанне ў рускай і заходнееўрапейскіх літаратурах, становяцца важным структураўтваральным кампанентам чалавечай псіхікі героя М. Гарэцкага і спрыяюць працэсам развіцця беларускай псіхалагічнай прозы экзістэнцыяльнай скіраванасці.

Схільнасць да экзістэнцыяльнага светабачання сфарміравалася ў М. Гарэцкага яшчэ ў ранні перыяд творчасці: філасофская дамінанта прысутнічае ў цыкле «Што яно?», абвостранае пачуццё смерці ўласціва «ваенным» творам М. Гарэцкага, многім апавяданням («Хаўтуры», «Стары прафесар», «Страшная музыкава песня» і інш.), драматычным абразкам («Атрута», «Антон»). Роздумам над тым, што ёсць чалавек у часе і прасторы, прасякнуты «Стогны душы», «Габрыелевы прысады», «Ідуць усе – іду я...», «Максімава зязюля» і інш.

«Скарбы жыцця» М. Гарэцкага вылучаюцца моцным счапленнем філасофскага і суб’ектыўнага пачаткаў, што набліжае побытавае біяграфічнае жыццё да экзістэнцыяльнага. Гэта выводзіць твор за межы жыццеапісальнай аўтабіяграфіі і надае ёй статус экзістэнцыяльнай. У «Скарбах…» змянілася мадэль жанру, не захавана гісторыка-падзейная аснова, зрухі адбыліся і ў змесце. Тут назіраецца не проста жыццё канкрэтнага чалавека – Максіма Гарэцкага. *Жыццё* становіцца катэгорыяй экзістэнцыяльнай (на бясконцай духоўнай глыбіні) і анталагічнай (у космасе, у боскім свеце): гэта *жыццё* паміж нараджэннем і смерцю; *жыццё* як антыпод смерці.

Выразная прыкмета экзістэнцыяльнай свядомасці М. Гарэцкага – загадзя ведаць, што апошняя ісціна недасягальная, але тым не менш да яе варта імкнуцца і спасцігаць. На гэтым шляху магчыма шмат памылак, таму так часта сустракаецца ў творах «Ідуць усе – іду я...», «Скарбы жыцця» брэйгелеўска-метэрлінкаўскі матыў слепаты («О мой край! О мой край! Бачу я бясконцы спрадвечны шлях у пустым вялікім полі. І – падарожнікаў... Палатняныя хатылі на плячох. Сляпыя вочы. І цёмныя потныя крыжыкі на відных з сарочкі худых грудзёх, там, дзе цьмяны ад сонца пасак на целе. Наўкола – жудасна-ціхая пустэльня. А ў ёй – шарпанне ног крок за крокам. Жудасна-марудны крок. Вечнасць. Хада...» [5, с. 18]).

Нельга не згадаць яшчэ адзін аспект творчасці М. Гарэкага – навукова-даследчы. Кніга «Гісторыя беларускае літаратуры» [6] дае магчымасць гаварыць пра выдатныя здольнасці М. Гарэцкага-тэарэтыка, які заклаў падмурак беларускага тэарэтычнага літаратуразнаўства. М. Гарэцкі-тэарэтык звяртаў увагу на ролю і значэнне фальклорнай традыцыі, у якой ён бачыў багаты эстэтычны вопыт народа. Грунтоўнае даследаванне фальклорных уплываў было надзвычай актуальным у той час, бо яно адбывалася на фоне навуковай дыскусіі 1920–1930-х гг. аб узаемастасунках літаратуразнаўства і фалькларыстыкі, пытаннях паэтыкі літаратуры і фальклору, аб праблеме пераходу ад фалькларызму асобных твораў і пісьменнікаў да літаратурна-фальклорных стасункаў у межах цэлых перыядаў і нацыянальных культур. Так, вядомы рускі і савецкі фалькларыст і літаратуразнавец Ю. М. Сакалоў пісаў: «… без внимательного учёта явлений фольклора теоретическое литературоведение не в состоянии построить прочной целостной системы научного знания» [7, с. 288]. Доследы М. Гарэцкага-вучонага паказалі, што творы фальклору (фальклор як мастацтва слова) могуць стаць паўнавартасным прадметам літаратуразнаўчага аналізу.

Зварот даследчыка да старажытнай літаратуры актуалізаваў важную тэарэтычную праблему перыядызацыі. Найперш важна адзначыць гістарычны падыход М. Гарэцкага: ён улічваў ролю і месца кожнага этапа ў агульным працэсе гістарычнага развіцця народа. Так, перыядызацыя старажытнай літаратуры абумоўлена ў вучонага найперш гісторыка-храналагічным падыходам. Пазнейшыя перыяды развіцця мастацтва слова даследчык характарызуе з улікам ідэйна-тэматычных і літаратурна-мастацкіх прынцыпаў.

Вызначаючы перыяды старажытнай беларускай літаратуры і іх характарыстыкі, М. Гарэцкі асэнсоўвае прыгожае пісьменства ў яго зменлівых сацыяльна-культурных кантэкстах. Гісторыка-функцыянальны прынцып падыходу да вывучэння літаратуры дае магчымасць М. Гарэцкаму-вучонаму даследаваць бытаванне твораў у вялікім гістарычным часе. І тут варта гаварыць пра распрацоўку беларускім даследчыкам прынцыпаў гістарычнай паэтыкі, тое, што А. М. Веселоўскі называў «эвалюцыяй паэтычнай свядомасці і яе форм» [8, с. 42]. Даследаванне эвалюцыі мастацкіх форм і творчых прынцыпаў пісьменнікаў X–XVIII ст. засведчыла канцэптуальныя маштабы мыслення вучонага, якое было скіравана на асэнсаванне не проста саміх твораў, а грамадскай свядомасці народа, яго легенд і паданняў як вялікіх культурных каштоўнасцей.

Вывучэнне старажытнага перыяду развіцця літаратуры абумовіла зварот М. Гарэцкага да перакладных антычных і сярэдневяковых заходнееўрапейскіх твораў, якія, на думку вучонага, падрыхтавалі ўзлёт арыгінальнай беларускай літаратуры ў XVI ст. Гэта былі першыя крокі М. Гарэцкага ў галіне кампаратывісцкіх даследаванняў, што дазваляла вучонаму ўпісваць беларускае мастацтва слова ў шырокі еўрапейскі кантэкст.

На навуковую канцэпцыю М. Гарэцкага паўплываў і агульны стан тэарэтычнага літаратуразнаўства 20-х гг. XX ст., якое было неаднародным і markdown розналакіраваным. Папулярны на той час фармальны метад (В. Б. Шклоўскі) і сацыялагічны прынцып (В. Ф. Пераверзеў і яго школа) унеслі свае карэктывы. Але пры ўсім пры гэтым М. Гарэцкі аддаваў перавагу тэарэтычным дасягненням культурна-гістарычнай школы, яе метадалагічным урокам.

Звернем увагу яшчэ на адно важнае паняцце, якое часта сустракаецца ў «Гісторыі беларускае літаратуры», – гэта *літаратурны жанр*. Трэба сказаць, што і сёння характарыстыка твора паводле яго жанравых прыкмет досыць складаная. Б. В. Тамашэўскі адзначаў: «…жанровые признаки не дают возможности

логической классификации жанров по одному какому-нибудь основанию» [9, с. 137]. Да таго ж многія аўтары свае творы называюць адвольна («Мертвые души» М. Гогаля – паэма, «Птушкі і гнёзды» Я. Брыля – «кніга адной маладосці», «Василий Тёркин» А. Твардоўскага – «кніга пра байца»). М. Гарэцкі, характарызуючы *жанр*, называе і родавыя прыкметы, і прыкметы ў межах родаў літаратуры, і стылявыя характарыстыкі. Тым самым даследчык падкрэслівае ўніверсальны характар дадзенай катэгорыі.

М. Гарэцкі-гісторык, тэарэтык літаратуры ў сваіх навуковых пошуках спалучаў лепшыя тэарэтыка-літаратурныя набыткі рускіх тэарэтычных школ са спецыфікай развіцця нацыянальных адметнасцей прыгожага пісьменства. Прыжыццёвыя выданні кнігі «Гісторыя беларускае літаратуры» паказалі, што М. Гарэцкаму не ўласцівы дагматызм, метадалагічная жорсткасць, аморфнасць мыслення. Вучоны не баяўся карэляваць свае папярэднія погляды, праўда, часам гэта было небяспечна для самога даследчыка, але аўтарскія навуковыя прыярытэты патрабавалі недагматычнага падыходу да інтэрпрэтацыі мастацкіх твораў.

Дасягненні М. Гарэцкага ў галіне тэарэтычнага літаратуразнаўства каштоўныя ва ўсіх адносінах. М. Гарэцкі ўпершыню самастойна ажыццявіў спробу абагуліць вялікі літаратурны матэрыял беларускага народа, стымуляваў даследчыкаў на новыя тэарэтычныя доследы, надаваў перспектыву літаратуразнаўчым пошукам. Распрацаваныя вучоным тэарэтычныя аспекты маюць і гуманістычную значнасць, яна ў тым, каб даць максімальна шырокі спектр абагульненняў, здольных выявіць саму сутнасць мастацкай літаратуры, яе гуманістычны аспект.

### Літаратура


1. *Адамовіч, А.* «Браму скарбаў сваіх адчыняю...» : даслед. жыццёвага і творчага шляху М. Гарэцкага / А. Адамовіч. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1980. – 224 с.
2. *Гарэцкі, М.* Збор твораў : у 4 т. / М. Гарэцкі ; рэдкал.: А. М. Адамовіч [і інш.] ; Акад. навук БССР, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Маст. літ., 1984–1986. – Т. 3 : На імперыялістычнай вайне ; Віленскія камунары / рэд. М. І. Мушынскі ; падрыхт. тэкстаў і камент.: Т. С. Голуб, В. Ю. Дэконскай. – 1985. – 399 с.
3. *Одоевский, В. Ф.* «Текущая хроника и особые происшествия». Дневник 1859–1869 гг. / В. Ф. Одоевский // Литературное наследство / Рос. акад. наук, Ин-т мировой лит. – М., 1935. – Т. 22/24. – С. 79–308.
4. *Гарэцкі, М.* Творы. Дзве душы : аповесць ; Апавяданні ; Жартаўлівы Пісарэвіч : п'еса ; Літаратурная крытыка і публіцыстыка ; Лісты / М. Гарэцкі ; уклад. і камент. Т. С. Голуб ; рэдкал.: А. М. Адамовіч [і інш.] ; Акад. навук БССР, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 629 с.
5. *Гарэцкі, М.* Скарбы жыцця / М. Гарэцкі // Полымя. – 1993. – № 2. – С. 3–34.
6. *Гарэцкі, М.* Гісторыя беларускае літаратуры / М. Гарэцкі ; уклад. і падрыхт. тэксту Т. С. Голуб. – Мінск : Маст. літ., 1992. – 479 с.
7. *Соколов, Ю. М.* Фольклористика и литературоведение / Ю. М. Соколов // Памяти П. Н. Сакулина : сб. статей. – М. : Никитинские субботники, 1931. – С. 280–289.
8. *Веселовский, А. Н.* Историческая поэтика / А. Н. Веселовский. – М. : Высшая школа, 1989. – 648 с.
9. *Томашевский, Б. В.* Теория литературы. Поэтика : учебное пособие / Б. В. Томашевский. – М. : Аспект Пресс, 1999. – 334 с.


### References


1. Adamovich, A. «Bramu skarbaw svaih adchynjaju...» : dasljed. zhyccjovaga i tvorchaga shljahu M. Gareckaga / A. Adamovich. – Minsk : Vyd-va BDU, 1980. – 224 s.
2. Garecki, M. Zbor tvoraw : u 4 t. / M. Garecki ; redkal.: A. M. Adamovich [i insh.] ; Akad. navuk BSSR, In-t lit. imja Ja. Kupaly. – Minsk : Mast. lit., 1984–1986. – T. 3 : Na impjeryjalistychnaj vajnje ; ViljenskiJa kamunary / red. M. I. Mushynski ; padryht. tekstaw i kamjent.: T. S. Golub, V. Ju. Dekonskaj. – 1985. – 399 s.
3. Odoevskij, V. F. «Tekushhaja hronika i osobye proisshestvija». Dnevnik 1859–1869 gg. / V. F. Odoevskij // Literaturnoe nasledstvo / Ros. akad. nauk, In-t mirovoj lit. – M., 1935. – T. 22/24. – S. 79–308.
4. Garecki, M. Tvory. Dzvje dushy : apovjesc" ; Apavjadanni ; Zhartawlivy Pisarevich : p'jesa ; LitaraturnaJa krytyka i publicystyka ; Listy / M. Garecki ; uklad. i kamjent. T. S. Golub ; redkal.: A. M. Adamovich [i insh.] ; Akad. navuk BSSR, In-t lit. imja Ja. Kupaly. – Minsk : Mast. lit., 1990. – 629 s.
5. Garecki, M. Skarby zhyccJa / M. Garecki // Polymja. – 1993. – № 2. – S. 3–34.
6. Garecki, M. GistoryJa bjelaruskaje litaratury / M. Garecki; uklad. i padryht. tekstu T. S. Golub. – Minsk : Mast. lit., 1992. – 479 s.
7. Sokolov, Ju. M. Fol"kloristika i litjeraturovjedjenije / Ju. M. Sokolov // PamJati P. N. Sakulina : sb. statjej. – M. : Nikitinskije subbotniki, 1931. – S. 280–289.
8. Vjesjelovskij, A. N. IstorichjeskaJa poetika / A. N. Vjesjelovskij. – M. : Vysshaja shkola, 1989. – 648 s.
9. Tomashjevskij, B. V. Tjeorija litjeratury. Poetika : uchjebnoje posobije / B. V. Tomashjevskij. – M. : Aspjekt Prjess, 1999. – 334 s.